Падтрымай "Вясну" на PATREON

Арганізатара мітынга прадпрымальнікаў, які адбыўся ў Баранавічах, асудзілі ў Барысаве

05.08.2016 **Тэгі**: суды, адміністратыўны пераслед, свабода мірных сходаў



Алесь Абрамовіч. Фота licviny.info

Суддзя суда горада Барысава і Барысаўскага раёна **Сяргей Герасімовіч** пачаў судовае паседжанне 4 жніўня а 15-й гадзіне са скандалу. Ён выдаліў з судовай залы рэдактара і выдаўца незалежнай газеты «Барысаўскія навіны» **Анатоля Букаса**. Быццам гэты дзеяч сродкаў масавай інфармацыі парушаў працэсуальны парадак правядзення слуханняў па адміністрацыйнай справе паводле артыкула 23.34 КоАП РБ ў адносінах да арганізатара баранавічскага мітынга **Алеся Абрамовіча**. Спадар Букас віны

сваёй не прызнаў і зрабіў запіс у Кніге заўваг і прапаноў Барысаўскага суда з нагоды супрацьзаконных, на яго думку, паводзінаў Сяргея Герасімовіча. Зараз, на працягу месяца, мясцовае судовае кіраўніцтва павінна даць пісьмовы адказ рэдактару «БН» з нагоды яго скаргі.

Старшыню Барысаўскай арганізацыі Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамада) і сябра аргкамітэта па стварэнні незалежнага прафсаюза прадпрымальнікаў «Салідарнасць» Алеся Абрамовіча суд прызнаў цалкам вінаватым у правядзенні несанкцыяванай пратэстнай акцыі ў Баранавічах 5 чэрвеня. Сацыял-дэмакрату прысудзілі сорак базавых вялічынь штрафу паводле часткі 3 артыкула 23.34 КоАП РБ. Гэта складае 840 дэнамінаваных рублёў ці 8 міліёнаў 400 тысяч старых рублёў.

Агульная сума накладзеных на Алеся Абрамовіча спагнанняў і штрафаў за удзел у лютаўскіх і сакавіцкіх прадпрымальніцкіх мітынгах пратэста ў Мінску, а таксама за арганізацыю падобных мерапрыемстваў вясной і летам бягучага года у Барысаве, Жодзіне, Маладзечна, Баранавічах і Воршы склала 217 базавых вялічынь альбо 45 міліёнаў 570 тысяч недэнамінаваных рублёў.

Твитнуть









Рэпрэсаваны “Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску

"Катаванні сталі ў Беларусі звычайнай справай". Беларускія праваабаронцы — на канферэнцыі АБСЕ

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных

WWW.GAZETABY.CO

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА

"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур’ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"



ГАЛОЎНАЕ

Рэпрэсаваны “Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску





АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Народжаная пад дубінкамі на Чарнобыльскім шляху". Як пачыналася "Вясна"

Мужчыну асудзілі за ўдзел у Маршы і бойку з прычыны "палітычнай абстаноўкі" у 2020 годзе

У Мінску судзяць стрыечнага брата намесніка камандзіра палка Каліноўскага Вадзіма Кабанчука: пракурор просіць тры гады калоніі

Міжнародная супольнасць віншуе “Вясну” з днём народзінаў

Мужчыну асудзілі на год "хіміі" за сарваны сцяг

"Мы не хочам быць заложнікамі", – вясноўцы на акцыі ў Вільні

Затрыманні і арышты: хроніка палітычнага пераследу 24-26 красавіка (дапоўнена)

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць

"Суды згубілі сваю функцыю, а грамадзянская супольнасць перанесла знішчальную атаку". Павел Сапелка — на канферэнцыі АБСЕ

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць







ПАРТНЁРСТВА

СЯБРОЎСТВА

























E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY